## БЯРОЗКІНА ЛІДЗІЯ ДЗЯМ’ЯНАЎНА



**Дата смерці:** 22.09.1942

**Месца подзвігу:** г. Віцебск

**Дата подзвігу:** верасень 1942

**Ушанаванне:** г. Віцебск – помнік героям Віцебскага падполля на месцы пакарання падпольшчыкаў каля Смаленскага ранка (вуліца 1-я Краснабрыгадная);
мемарыяльная пліта на брацкай магіле (Старасямёнаўскія могілкі);
мемарыяльная дошка на будынку друкарні (Шчарбакова-Набярэжная,6)

Скончыўшы школу ў 1941 годзе, Лідзія Бярозкіна хацела пауступаць у педагагічны інстытут. Але пачалася вайна. Падчас акупацыі Лідзія працавала на аэрадроме і разам са сваімі таварышамі марыла здейсниць там буйную дыверсію. Таму яна называла сябе «Бомба» (гэта была і яе падпольная мянушка).

Лідзія Бярозкіна актыўна ўключылася ў барацьбу супраць фашысцкіх акупантаў. Яна была жыццярадаснай, імклівай і была завадатарам у шматлікіх справах. Дзякуючы гэтым якасцям яна ў свае 18 год змагла аб'яднаць камсамольцаў Віцебска ў падпольную групу. Маладыя людзі слухалі навіны з Масквы, затым Лідзія распаўсюджвала інфармацыю сярод знаёмых, дапамагала размножваць зводкі саўінфармбюро.

Яе група літаральна пад носам у немцаў, «падпрацоўваючы» ў прафашысцкай газеце «Новы шлях», друкавала на станках антыфашысцкія лістоўкі і распаўсюджвала іх. У гэтай справе яны былі першымі на тэрыторыі акупаванага горада.

Пры падрыхтоўцы дыверсіі на нямецкім вузле сувязі 7 верасня 1942 г. па даносу правакатара Лідзія Бярозкіна і 5 яе паплечнікаў былі арыштаваны. Выдаў Ліду правакатар Анатоль Бялячыц, што дэзерціраваў з Чырвонай арміі і быў завярбованы фашыстамі. Два тыдні гітлераўцы катавалі патрыётаў, але ўсе трымаліся стойка і ўратавалі ад арышту астатніх членаў групы. 22 верасня 1942 года на плошчы каля Смаленскага рынка акупанты павесілі герояў на вачах у бацькоў і сваякоў. «Злачынцаў»-падпольшчыкаў нікому не дазволілі пахаваць . Толькі маці Зіны Васільевай змагла выкупіць цела дачкі і аплакала яго. Астатнія былі пахаваны значна пазней на Старасямёнаўскіх могілках. Кажуць, да самай апошняй хвіліны Ліда не верыла, што яе выдаў Анатоль Бялячыц.

У 1968 г. на месцы пакарання падпольшчыкаў пастаўлены помнік; на брацкай магіле (вул. 3-я Полацкая, Новасямёнаўскія могілкі) ўстаноўлена мемарыяльная пліта; на будынку друкарні (Шчарбакова-Набярэжная,6) – мемарыяльная дошка.

ЛІТІРАТУРА

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Бярозкінай Л. Д. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990. – С. 131.